# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНТЭРАКТЫЎНАЙ АНЛАЙН-ДОШКІ СУМЕСНАГА ДОСТУПУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Леванкова Тацяна Аляксандраўна,***
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры, ДУА «Сярэдняя школа № 182 г. Мінска імя Уладзіміра Карвата»*
*(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)*

Разглядаюцца магчымасці інтэрактыўнай анлайн-дошкі сумеснага доступу, а таксама прыводзяцца прыклады яе выкарыстання на ўроках беларускай мовы.

**Ключавыя словы:** сучасныя тэхналогіі, адукацыйныя рэсурсы, інтэрактыўная анлайн-дошка сумеснага доступу Miro, стварэнне сумесных заданняў.

У сучасным развіцці грамадства значную ролю выконываюць новыя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Камп'ютарная адукацыйнасць з'яўляецца неабходным атрыбутам сучаснага вучня. Таму задачы, якія паўстаюць зараз перад сучасным настаўнікам, патрабуюць новых рашэнняў і падыходаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Новыя тэхналогіі і бязмежныя магчымасці інтэрнэту зрабілі сваю справу: зараз складана сустрэць настаўніка, выкладчыка, які не выкарыстоўваў бы ў сваёй практыцы магчымасці сусветнай павуціны. Калі раней на ўроках мы працавалі з падручнікам і прэзентацыяй, зробленай пры дапамозе Power Point, то зараз звяртаемся ўсё больш да аўдыя-/відэа суправаджэння, інтэрнэт-алімпіяд, стварэнне інтэрактыўных анлайн-тэстаў і іх аўтаматычнай праверкі. Усе больш і больш сучасны настаўнік імкнецца разнастаіць свой урок рознымі інтэрнэ т-рэсурсамі, платформамі.

Але пры разглядзе пытання «Што лепш выкарыстоўваць? », мы абавязкова сутыкаемся з вялікай колькасцю даступных лічбавых рэсурсаў для настаўнікаў. Выбар зрабіць цяжка, але самае галоўнае, на што патрэбна звярнуць увагу:

– даступнасць;
– лёгкасць у выкарыстанні;
– прадуктыўнасць;
– магчымасць сумеснай работы;
– магчымасць выкарыстання, як на ўроках, так і анлайн.

Miro – адзін з такіх рэсурсаў, які дазваляе не проста выкарыстоўваць на ўроках або анлайн, але і сумесна з усімі ўдзельнікамі ўрока, занятка, мерапрыемства і г.д.

Miro – дошка. Адрозненне Miro ад звычайнай дошкі ў тым, што яна інтэрактыўная і доступ да яе ажыццяўляецца праз інтэрнэт. А гэта значыць, што пісаць, маляваць, дадаваць файлы, размяшчаць заданні магчыма бясконца і ўсё гэта будзе бачна не тое, што з апошняй парты, але з любой кропкі свету.

Miro не патрэбна спецыяльна ўсталёўваць, працаваць з ёю можна адразу з браўзера. Працаваць з анлайн-дошкай зручна з планшэта або кампутара, але ёсць

магчымасць і па сродках тэлефона. Гэта бясплатная платформа, якая прапануе некалькі дошак і да 100 удзельнікаў.

Настаўнік можа абмежаваць правы ўдзельнікаў на выкарыстанне, выбіраючы тым самым рэжымы: рэдагаванне, каменціраванне або толькі прагляд. Кантэнт можна тэгіраваць па ўзроўнях і тады розным вучням будуць даступны розныя матэрыялы на адной і той жа дошцы.

Карыстанне анлайн-дошкай не выклікае цяжкасцей у вучняў, а настаўніку дае магчымасць адначасова захапіць урокам усіх вучняў, а можа і паралель класаў.

Прылады, якія выкарыстоўваюцца ў анлайн-дошцы, дазваляюць рэалізаваць самыя нестандартныя задумы настаўніка:

- загрузка файлаў, дакументаў, прэзентацый любога кантэнту;
- праца з шаблонамі;
- выкарыстанне сцікераў розных памераў, формаў, колераў;
- праца з фігурамі;
- магымасць дадаваць каментарыі, выстаўляць адзнакі вучням;
- ручка і гумка;
- і г.д.

Акрамя гэтага, ёсць прылады, якія дазваляюць арганізаваць зручнае ўзаемадзеянне з удзельнікамі:

- стварэнне новага «фрэйма»;
- запуск рэжыму прэзентацыі;
- прагляд каментарыяў;
- рэжым чата;
- карткі;
- скрыншэрынг (вучні ў гэтым рэжыме могуць ісці толькі за настаўнікам);
- галасаванне;
- рэжым «відэачат»;
- таймер;
- гісторыя змяненняў;
- і іншае.

Выкарыстанне Miro дазваляе праводзіць урокі ў розных фарматах: інтэрактыўны падручнік, навучальны вэбінар, групавая работа і іншыя варыянты.

Заданні можна ствараць пры дапамозе шаблонаў, якія прапанаваны стваральнікамі, або прыдумаць самастойна.




**Малюнак 1. Заданне па раздзеле «Лексіка»**

Выконваць заданні могуць адначасова ўсе удзельнікі або кожны самастойна.




**Малюнак 2. Заданне па тэме «Самастойныя і службовыя часціны мовы»**

Інтэрактыўная анлайн-дошка дае магчымасць настаўніку не толькі быць назіральнікам за выкананнем задання, але і прымаць непасрэдны ўдзел у працэсе працы: даваць каментарыі, напраўляць, падводзіць да адказаў, выпраўляць і г.д.

Адным са станоўчых бакоў анлайн-дошкі з'яўляецца і тое, што на ёй можна размясціць матэрыялы для праверкі ведаў вучняў: тэсты, карткі для запаўнення, графічныя праверачныя работы і іншае.

Таксама Miro дазваляе размяшчаць дыдактычны матэрыял для самастойнага або сумеснага вывучэння тэм: спасылкі, відэа/фота матэрыялы, разнастайныя спасылкі або фрагменты старонак.




**Малюнак 3. Заданне суправаджаецца відэаматэрыялам**

Як бачым, выкарыстанне дадзенай платформы дазваляе нам якасна арганізваць урок на любым яго этапе: ад актуалізацыі да праверкі ведаў.

Такім чынам, інтэрактыўная анлайн-дошка сумеснага выкарыстання Miro дазваляе настаўніку якасна арганізаваць адукацыйны працэс у сённяшніх умовах, а таксама зацікавіць вучняў нестандартным падыходам да правядзення ўрока.

**Літаратура**


1. Афіцыйны сайт интэрнэт-рэсурса [электронны рэсурс] - рэжым доступу https://miro.com/
2. Виртуальная доска MIRO [электронны рэсурс] - режым доступу http://expert.itmo.ru/miro : Дата доступу 20.11.2021.
3. Образцов Эдуард, 10 лучших онлайн-досок с возможностью совместной работы в реальном времени [электронны рэсурс] / Эдуард Образцов/ Педсовет. - Рэжым доступу : https://pedsovet.org/article/10-lucsih-onlajn-dosok-s-vozmoznostu-sovmestnoj-raboty-v-realnom-vremeni. – Дата доступу 22.11.2021.


## THE USAGE OF THE INTERACTIVE ONLINE SHARING BOARD DURING BELARUSIAN LANGUAGE CLASSES


**T.A. Levankova**



The possibilities of an interactive online sharing board are considered and examples of its usage in the Russian language classes are given.



**Keywords:** modern technologies, educational resources, interactive online sharing board Miro, creation of joint tasks.